Сегодня еще можно подписаться на “Народную волю”. Заполните абонементный бланк *(смотри ниже)* — и на почту или в любой подписной пункт!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас

Народная Воля

№ 102 (224)

Субота, 14 чэрвеня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА “Народная воля”
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	4.18	21.40
Магілёў	4.26	21.31
Гомель	4.32	21.19
Мінск	4.37	21.42
Гродна	4.54	21.55
Брэст	5.04	21.46

Поўня 20 чэрвеня.

Зеркало

В американских пробирках белорусских свобод не вырастишь...

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель “Народной воли”

Ищу простое слово, с которого следует начать рассказ о событии. Была научно-практическая конференция, она длилась два дня и оставила после себя солидный сборник докладов. Слушая и читая, я, верно, и “перебрала” таких слов, как “модератор”, “NGOs”, “квазирынок”, “идолоизация” и так далее. Заимствования из английского так засорили сознание, что и неделю спустя затрудняют изъяснение по теме на общедоступном разговорном языке.

С одной стороны, на то и наука с ее узкоупотребимыми терминами и сложным категориальным аппаратом. Конференцию проводил Независимый институт социально-экономических и политических исследований. По очереди ее вели руководитель НИСЭПИ, доктор социологии Олег Манаев и сотрудники института — кандидат экономических наук Игорь Пелипась и кандидат физико-математических наук Юрий Дракохруст. Председательствующий и носил загадочное звание “модератор”. Сама по себе подробность незначительная, но обретала она символическое значение, поскольку сами выступавшие часто сетовали с трибуны на то, что “нас, демократических лидеров, народ не узнает”.

Распознать бывает мудрено. В кругу участников конференции, наверное, всем понятно, что NGOs — это неправительственные общественные организации. Именно их представители по приглашению НИСЭПИ съехались в Минск с Гродненщины, Брестчины, Гомельщины, Витебщины и Могилевщины, чтобы обменяться мнениями и мыслями. Но произнесите в толпе, на улице, в троллейбусе, на заводе, в магазине это самое “энжеос”! Никто не поймет. Ну, положим, они невежды, но истинно ли умен тот, кто, относя себя к политической элите, так и не научился живо и доходчиво общаться с людьми?

Ощущение, что сегодня белорусские демократы “страшно далеки от народа”, витает в среде студенческих, предпринимательских, профсоюзных, образовательных, культурных организаций, фондов, ассоциаций. Из него вырастает и едва ли не самый сущностный вопрос: а какие социальные слои стоят сегодня за либералами? Слоев не густо, что не без горечи признавали практически все ораторы.

Если кому интересно мнение со стороны, то оно таково: вакуум за элитой сгущается и по мере того, как она удаляется по направлению ко все более изысканным, тонким, глубоким формам исследования белорусской действительности по западным технологиям. Инструмент, положим, безупречен, да только заглубленный в гущу нашей здешней ядреной житухи он дает странные результаты. Выводы исследований, как правило, удовлетворяют интерес американского социолога или немецкого политолога, но они зачастую непостижимы для неискушенного белорусского рядового гражданина.

Мне кажется, что интеллектуальный цвет отечественной демократии про себя уже понял, что в иностранных пробирках, как бы ни были они совершенны, белорусских свобод не вырастишь. Мне кажется, что кто-то из аналитиков скоро скажет об этом вслух. Мне кажется, вполне назрело исследование такой проблемы. На постулате “народ нас не понимает” далее ехать некуда.

“Формирование общественных лидеров в посткоммунистическом обществе” — такой была тема конференции. И была она лишь частью большого проекта, которому НИСЭПИ посвятил много времени и сил. Конечно же, работа проделана не без пользы, накоплены ценные факты, сделаны выводы, обозначены явления и намечены тенденции. Несомненно, важно и то, что сам проект распространялся на регионы республики, на областные и районные центры, короче, на ту самую глубинку.

А как насчет лидеров не в теории, а в натуре?

Этой весной в Минске Объединенная гражданская партия признала общенациональным лидером оппозиции Геннадия Карпенко. В столице Беларуси это “назначение” не вызвало восторга у других партий. И чем далее от либералов влево, тем, ясное дело, более прохладное отношение к избраннику правого фланга.

Не заметно было энтузиазма по поводу обретения “впереди идущего” и в дни работы конференции, которая собрала на форум либеральных демократов именно с мест и озабоченных именно тем, как же растут, воспитываются, формируются, “раскручиваются” ведущие фигуры движения, как “рождается” тот, который мог бы составить личную конкуренцию авторитарно правящему ныне президенту.

Судя по выступлениям представителей провинции, демократическая окраинная Беларусь уповает на то, что откуда-то оттуда, из регионов, и должен явиться долгожданный общенациональный.

По моему мнению, конференция — как научная — была очень удачной. В докладах сконцентрирована масса интересного, враз не переваришь, многое пригодится для более полного осознания политического процесса. Другое дело практика.

Я вообще не уверена, что сегодня проблема лидера оппозиции волнует людей. Я даже убеждена, что яркий, умный и честный политик не может явиться в период затишья, реакции, всеобщей подавленности. Ну как тут выделиться без общественного подъема? А на подъем народ не дюж, пока не затронуты его собственные — а не элитарных политиков! — интересы. Вырази чаяния миллионов — и окажешься на коне, и сама собой отпадет необходимость жаловаться на то, что “нас, демократов, народ не любит”.

Профессионально и последовательно осуществляемые либеральные рыночные реформы — это ли сегодня чаяния миллионов жителей Беларуси? Или миллионы рынка не хотят? Ну пусть они не хотят, по выражению известного политолога Александра Потупы, “квазирынка”, то есть изуродованного, ложно трактуемого белорусского псевдорынка. А людям что в лоб, что по лбу, они не различают, что с приставкой “квази-”, что без оной. Не думаю, чтобы демократическому гению удалось бы одним лишь пламенным словом перевернуть умонастроения населения и реанимировать рыночную эйфорию первых лет. Этот ход к душе народной заколочен на долгие годы. Надо искать другие пути к широкому признанию.

“Идолоизацией” как термином в своих научных изысканиях пользуется кандидат философских наук, руководитель Независимого центра политических технологий Владимир Подгол — он же и автор публицистических статей в “Народной воле”. Идол у нас известно кто, тут и называть не надо, всем понятно. Почему народ Беларуси опять впал в вождизм, без памяти возлюбил харизматического “батьку” и добровольно отдал ему всю власть? Тоже, согласитесь, толстый пласт — пахать его теоретикам, не перепахать.

Характерно, что вывихи нынешней демократии, ее болезненные надломы и вопиющие противоречия и, в целом, наблюдаемый умопомрачительный маскарад идей очень многие аналитики склонны объяснять лишь тяжелейшим социалистическим наследием. Штамп “за семьдесят лет Советской власти...” или клише “партийная номенклатура” объясняют многое, но, однако ж, не все. И чем больше проходит времени, тем меньше объясняют нынешние парадоксы “родовые пятна” прошлого. Антикоммунизм был, есть и будет любимым орудием либералов, это естественно для них.

Однако попытка демократического развития общества, в том числе белорусского, насчитывает уже добрый десяток лет. Рано или поздно, хочешь или нет, но придется критически осмысливать сугубо либеральные ошибки и оценивать по достоинству демократические провалы. Исчерпала себя формула о том, что в возвращении тоталитаризма на Беларусь виноваты лишь “совки с их рабской психологией”.

Если долго-долго лидер остается без масс, то ущербен и он, а не только они.

Са святам Вас, беларускія медыкі!



Заўтра — Дзень медыцынскага работніка. Ну як напярэдадні свята не сказаць добрага слова пра тых, хто ў белым халаце ратуе наша жыццё, клапоціцца аб нашым здароўі. Каля 800 аперацый па вылечванню глаўкомы, катаракты і іншых хвароб зроку праводзяць, напрыклад, штогод мікрахірургі Магілёўскай абласной бальніцы. Іх высокую кваліфікацыю пацвярджае той факт, што кансультацыі для іх рэгулярна — раз у два месяцы — праводзяць спецыялісты Калужскага філіяла фёдараўскага інстытута мікрахірургіі вока.

На здымку: *аперацыя робіцца пад мікраскопам.*

Фота Мікалая ЦІТОВА, БелТА.

У міністра адукацыі новы намеснік

Пастановай урада намеснікам міністра адукацыі назначаны Аляксандр Іванавіч Купцоў. Выпускнік Магілёўскага педагагічнага інстытута, сваю працоўную дзейнасць ён пачынаў настаўнікам, затым стаў дырэктарам школы, а потым займаў пасаду старшыні Талачынскага райвыканкама. З 1986 года Аляксандр Іванавіч Купцоў працаваў намеснікам начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама.

БелТА.

Уладзімір Сянько ўручыў даверчыя граматы прэзідэнту Францыі Жаку Шыраку

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Францыі Уладзімір Сянько пачаў выконваць свае абавязкі. 10 чэрвеня ў Елісейскім палацы ён уручыў даверчыя граматы прэзідэнту Французскай Рэспублікі Жаку Шыраку.

БелТА.

Вайскоўцы – вяскоўцам

Дораному “жалезнаму каню” ў зубы не глядзяць

Згодна з распараджэннем урада краіны, Міністэрства абароны бязвыплатна перадае сельскагаспадарчаму ведамству каля двухсот грузавых аўтамабіляў. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведамілі ў Мінсельгасхарчы.

Дзмітрый ФЁДАРАЎ, БелТА.

Пісьмо простага чалавека

Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, я падпісаўся на “Народную волю”

Паважаная рэдакцыя!

Ваша газета трапіла мне ў рукі выпадкова. Прачытаўшы, я зразумеў: гэта крыніца аб’ектыўнай, усебакова абгрунтаванай інфармацыі. Нейкі час купляў “Народную волю” з рук, а ў 1996 годзе падпісаўся. Як пенсіянер, сутыкаюся з фінансавымі цяжкасцямі, але, не зважаючы на гэта, падпісаўся на “Народную волю” да канца года.

Я хачу, каб Ваша газета існавала і несла святло ў душы людзей, будзіла іх свядомасць, разрывала ланцугі рабскай ідэалогіі, якімі доўгі час аблытвалі нас і працягваюць рабіць гэта цяпер.

Жадаю “Народнай волі” заўжды заставацца маяком праўды і аб’ектыўнасці.

Пакуль буду жыць, а “Народная воля” — існаваць, буду чытаць кожны радок на старонках вашага выдання.

З павагай да рэдакцыі —
П.С.СУДНІК.
Мінск.

Дэмакратыя па-беларуску?

Тры дзесяткі судовых працэсаў на... дваіх. Ці ж не занадта?

За два няпоўныя гады — мінулы і пяць месяцаў сёлетняга — магілёўскія праваабаронцы Сяргей Абадоўскі і Валерый Сівуха ўдзельнічалі больш чым у 30 судовых працэсах, абараняючы грамадзянскія правы актывістаў мясцовых дэмакратычных арганізацый.

Яны ж склалі і накіравалі ў праваахоўныя органы і міжнародныя арганізацыі каля ста пяцідзесяці пратэстаў па фактах парушэнняў грамадзянскіх правоў і свабод. А таксама “назапасілі” каля 300 дакументаў, у якіх мясцовыя ўлады ўціскалі правы і свабоды грамадзян.

Па прапанове Валерыя Іванавіча Сівухі ў абласным цэнтры вырашылі стварыць “Белую кнігу парушэнняў правоў чалавека ў г.Магілёве”. Ужо знайшлі ў кнізе прытулак першыя ластаўкі былых гучных спраў і працэсаў, аб якіх не так даўно гаварыў увесь горад. Разглядаюцца, аналізуюцца, сістэматызуюцца і абагульняюцца іншыя матэрыялы, якім наканавана быць “гістарычнымі” для Магілёўшчыны.

Віталь ЧАВУСКІ.

Вяртанне

Да юбілею вялікага земляка

У святкаванне 110-годдзя з дня нараджэння Марка Шагала вырашыла ўнесці свой уклад і акцыянернае таварыства “Віцебскія дываны”. У гонар вядомага ўраджэнца горада на Дзвіне на прадпрыемстве сатканы дыван, які ўпрыгожыць залу мясцовага мастацкага музея, дзе адбудуцца асноўныя ўрачыстасці, прысвечаныя гэтай знамянальнай даце.

Вольга СІДАРОВІЧ, БелТА.

Актуальна!

Хто больш за ўсіх чакае зарплату?

Нягледзячы на распараджэнні прэзідэнта ліквідаваць запазычанасць па зарплаце, яна працягвае расці: калі ў канцы красавіка людзям не было выдадзена 439,7 мільярда рублёў зарплаты, дык праз месяц — ужо 705,6 мільярда рублёў, або 13,3% ад усяго фонда заработнай платы. Па назіраннях прафсаюзных актывістаў, пры набліжэнні запазычанасці да трыльёна рублёў пачынае ліхарадзіць працоўныя калектывы найперш прамысловых прадпрыемстваў.

Мабыць, гэты момант і ўлічваюць улады. Бо назіраюцца розныя падыходы да выплаты зарплаты розным катэгорыям працоўных. Тыя, хто выказвае незадаволенасць, готовыя выйсці на мітынг, і атрымоўваюць грошы больш-менш рэгулярна, а хто церпіць — той наогул сядзіць без рубля. Гэта асабліва ярка высвечвае аналіз запазычанасці па зарплаце па галінах народнай гаспадаркі, праведзены спецыялістамі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Так, калектывы прамысловых прадпрыемстваў, якія больш-менш актыўна выступаюць за свае правы, зарплату атрымоўваюць з невялікім спазненнем. Запазычанасць па ёй у прамысловасці складае толькі 7,4% ад усяго фонда заработнай платы. Напомню, што ў сярэднім па народнай гаспадарцы гэты паказчык роўны 13,3%. Такім чынам, рабочым заводаў увагі надаецца ў два разы болей.

А вось калгаснікі маўчаць. Больш таго, часта ў друку і па тэлебачанню яны горача падтрымліваюць “дарагога” Аляксандра Рыгоравіча. Таму і сядзяць часта без грошай, хоць і працуюць ад цямна да цямна, асабліва ў час адказных палявых работ. Запазычанасць па зарплаце калгаснікам на канец мінулага месяца склала 65,1% у фондзе ўсёй зарплаты. У рабочых саўгасаў — 37,7%. Вось такая “ўдзячнасць” прэзідэнта за падтрымку. А што яму рабіць? Паспрабуй столькі грошай затрымаць рабочым Мінска, дык яны ж могуць і на вуліцу выйсці. А калгаснікам варта наабяцаць па тэлебачанню лепшага жыцця, і яны будуць маўкліва цярпець. Правільна заўважана мудрымі продкамі: “Хто як дбае, той так і мае”.

Алесь ДРАБЧУК.

Даже если Вы подпишетесь на “Народную волю” на один месяц — у Вас есть шанс выиграть ценный приз!

Дорогие читатели!

Если "Белпочта" не продлит сроки, то сегодня — последний день подписки.

Мы еще раз приглашаем Вас принять участие в розыгрыше лотереи среди тех, кто решил оформить подписку на вторую половину 1997 года. Обладатели “билетов удачи” действительно получат ценные призы — холодильники, телевизоры, магнитофоны, мебельные гарнитуры, кофеварки, спортивный инвентарь, библиотечки и многое-многое другое.

Не опоздайте! Вы, как мы уже отмечали, имеете шанс выиграть дорогостоящую вещь, даже если подпишетесь только на один месяц.

Напоминаем: наш индекс 63222. Стоимость на месяц — 29 тысяч рублей, на квартал — 87, на полгода — 174 тысячи. Подписаться можно в любом подписном пункте. Подробная информация — в приложении к каталогу.

ЛОТЕРЕЯ!

Уважаемые подписчики, вырежьте этот купон, заполните его и отошлите по адресу: **220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а, "Народная воля".** На конверте сделайте пометку "Лотерея". Авторитетная комиссия определит победителей.

Ф.И.О. ____________________

Адрес ____________________

Внимание!
В розыгрыше участвует один купон. Письма присылайте до 25 июня 1997 г
Призы победителям вручат при наличии подписного абонемента!

О времени проведения розыгрыша редакция сообщит дополнительно.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 6 3 2 2 2 (індэкс выдання)

Народная Воля

Колькасць камплектаў

на 1997 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________ (паштовы індэкс) ____________ (адрас)

Каму ____________ (прозвішча, ініцыялы)

ПВ	месца	літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 6 3 2 2 2 (індэкс выдання)

Народная Воля

Кошт	падпіскі ___ руб.	Колькасць камплектаў
	пераадрасоўкі ___ руб.	

на 1997 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________ (паштовы індэкс) ____________ (адрас)

Каму ____________ (прозвішча, ініцыялы)

Задумаемся...

Почему мы, белорусы, так держимся за рабство и духовное угнетение?

У каждого государства, нации, отдельного человека — своя судьба. Но было бы неверно все списывать на злой рок. Американский экономист, лауреат Нобелевской премии Василий Леонтьев прозорливо утверждал: "Везет всегда тому, у кого голова на плечах". И жизнь эти слова подтверждает. Ведь смогли же на руинах второй мировой войны поверженные Германия и Япония с помощью своего недавнего противника трансформировать свои разрушенные экономики. Смогли, причем быстро. Смогли наши соотечественники в годы правления К.Мазурова и П.Машерова преобразить лицо республики, смогли.

Но последнее скорее исключение из правил. Наш путь — это все же больше череда рабства и духовного угнетения. Вместе со своим старшим братом мы так и шагаем под барабанную дробь идеологической шелухи рядом с бедностью и глупостью.

Что в итоге сегодня имеем? Бедную неблагополучную страну, так и не ставшую на прогрессивный путь развития. А в этой стране, между прочим, живут трудолюбивые, симпатичные люди. Где наше место сегодня? На самых задворках Европы, с чьей глухой периферии и собираемся вползать в новое тысячелетие.

Прогресс любой цивилизации так или иначе связан с подъемом экономики. Это аксиома. Мировая экономика — это единая система, где ее национальные составляющие завоевывают свое место под солнцем.

Боюсь ошибиться, но нынешняя государственная машина, на мой взгляд, исчерпала свои последние ресурсы. Она не смогла стать хозяином, способным навести порядок в своем собственном доме, и не позволила развязать руки своим промышленникам и аграриям, способным преодолеть глубокий экономический кризис.

Грустно смотреть на дела человеческие, чувствуя и свою вину к сопричастному. Многострадальная Беларусь стала вроде международной резервации, полигона, где отрабатываются самые сомнительные эксперименты по выживаемости народа при холодном созерцании остального Света.

Существует, значит, какая-то зловещая закономерность в том, что именно у нас разгорается очаг вражды между прошлым и будущим и на миролюбивый народ, никогда за свою историю, повторяю, никогда, не поднимавшего руку на соседа, падает столько напастей. Значит, лежит тень проклятья на родной земле, по которой суждено постоянно пролегать границе конфронтации между военными блоками Запада и Востока.

Многие наши беды не столь даже от ошибочности политических линий и зигзагов, как скорее от посредственности власти. На протяжении всей мировой истории между народом и властью всегда существовала пропасть. И социальный протест всегда был признаком выздоровления общества. Хочу об этом персонально напомнить историку А.Г.Лукашенко. Нынешней бюрократической власти можно дать старую емкую характеристику: коррупция и произвол. Гнет неразумного правления сегодня ощутил кожей самый простой человек с улицы. Он начинает понимать, что потенциалом, стилем и обличьем нынешняя власть никак не тянет на минимальные мировые стандарты.

История учит нас судить по делам, а не по красивым словам. Давайте же вместе оглядимся и порассуждаем, чего достигла страна за последнюю пятилетку (привычный период) в экономике, политике, культуре. Говорят, чтобы объективно оценить что-либо, надо проделать это в трех проекциях: снизу, сбоку и сверху. Ну, насчет низа (от народа) все предельно ясно — здесь запрограммирован, как всегда, ошеломляющий успех. И это несмотря на то, что вместо хлеба и колбасы ему будут нести очередную демагогию с телеэкрана. По отношению к нам сопредельных государств (сбоку) и мирового сообщества (сверху), извините, полный конфуз получается. Европа знает, с кем имеет дело, и обращается соответствующим образом — как того заслужили. Как говорят, нечего на зеркало пенять.

XIX и XX века, как вы помните, начинались весьма бурно. Удастся ли на этот раз нам, не всегда старательно усваивающим уроки истории, уберечься от новых потрясений?

Для терпеливого и робкого белоруса ни разоблачения прошлого, ни народившиеся ростки свободной жизни так и не стали убедительными аргументами в выборе ориентиров будущего. Ему ясно одно — страна зависла в неуклюжей позе между нестыкуемыми состояниями. Десятками лет насаждавшийся уклад жизни крепко сидит в головах людей, особенно старшего поколения, да и начальственных тоже (как ни крути, а потерять место риск велик). Его не просто вышибить даже взамен на самую прогрессивную модель хозяйственно-бытовой культуры.

Ближайшие планы вроде известны — будем строить братский союз. Как говорится, совет да любовь на повторный брак! Правда, к этому большому событию примешивается и доля горечи — не участвует в этом действе средний брат — украинец. Как никто другой, он понимает, что полнокровный и взаимоуважительный союз с Русью это одно, а с коррумпированной и прогнившей Москвой — другое.

Как бы не стал такой скоропалительный Союз, в котором стороны четко не обозначили свою общность в духовных ценностях и материальных целях, свою ответственность друг перед другом, диалогом глухих. Расплачиваются, как правило, другие. А потеря свободы, пусть и недолгая, способна быстро разрушить изнутри и без того больное общество.

И все же одного не могу понять. От Минска одинаково далеко добираться как до Берлина, так и до Москвы. Так нет же — не к цивилизованной объединяющейся Европе стремимся, а все больше косим на Азию.

Земля белорусская не обделена талантами. Наше будущее — за новой генерацией молодых экономистов, политологов, юристов. Будущее в новых открытиях, в свободном, а не принудительном труде, от которого человек способен получать материальное и творческое удовлетворение.

Будущее, наконец, в сильном государстве, сила которого не в политическом угаре словоблудия и милицейской дубине, а в справедливом законе, формирующем нравственное и гражданское здоровье общества.

На рубеже тысячелетий у Старого Света замерцал, наконец, реальный шанс создать единое экономическое пространство и коллективную систему безопасности, распустив свои национальные армии. И для нас, белорусов, будет позором противиться естественному ходу истории. Она этого не прощает.

Давайте не забывать об этом. Во имя будущего.

Геннадий ТЕРЕНЯ,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва.

Новыя вершы

Ніл ГІЛЕВІЧ

Не пытаюся...

Не пытаюся, бо знаю, Маці,
Знаю, што ім трэба ад цябе —
Гэтым нелюдзям жандарскай масці,
Гэтай прагнай, хцівай галыцьбе.

Знаю, чым ты іх так угнявіла,
Адчаго і шал на іх найшоў:
Воля, воля ім твая няміла,
Уваскрэслая з магіл дзядоў!

Не да смаку ім, што праўды светач
Азарыў тваіх вякоў прастор,
Што, як роўная, ты з цэлым светам
За адзін усаджваешся стол.

Ім нялюба, што на вольнай волі
Дыхаць робіцца табе лягчэй,
Што дала ты клятву — больш ніколі
Не ўгінаць перад ярмом плячэй.

Дык трымайся ж гэтай мужнай клятвы!
Не сагніся, Маці, і не ўкленч!
Не зважай, што нейкі найміт платны
Прымярае адэкватны фрэнч.

На сваёй зямлі адвечнай, Маці,
Не дадзім мы ўкрыжаваць цябе —
Гэтым нелюдзям жандарскай масці,
Гэтай прагнай, хцівай галыцьбе!

1997, травень.

Нават з амбону

Божа праведны! Нават з амбону
Бласлаўляецца ўладным крыжом —
Не Свабода, не святасць Закону,
А душы беларускай пагром.

Пра якое яднанне ён кажа —
Гэты знаны вялебны святар?
Злыдзень рукі вяроўкаю вяжа,
Што паклалі вянок на алтар.

Пра якую духоўнасць вяшчае?
Пра якую маральнасць гудзе?
Злыдзень мову народа знішчае
І на вусны мне пломбу кладзе.

Пад якою харугвай святою
Ён пяе — каб і я падхапіў?
Злыдзень бруднай, паскуднай пятою
На святыні мае наступіў!

Для чаго ж, нібы дыму з кадзіла,
Напускае імглы ягамосць?
Каб забыў я, што наша Радзіма —
Гэта наша Радзіма і ёсць?

Марна, марна шчыруе вялебны!
Беларусь на планеце — адна.
Нашы продкі ў змаганнях палеглі
Не затым, каб згібела яна.

А затым, каб насуперак гвалту
Нейчай волі нялюдскай, сляпой,
Узрасла і набралася гарту
Пад уласнай харугвай святой.

1997, чэрвень.

Чучала з пыхай

Адрахлелае чучала
У суцэльна-бліскучых пагонах
Патрабуе рашучага
Павароту ў карысць палігонаў;
У карысць тэрмаядзерных
Установак і боегаловак —
Паўтырканых і складзеных
У палескіх барах і дубровах;
У карысць настальгічнага,
Незабыўнага "светлага раю"
І на здзек з безаблічнага,
З анемічна-бязмоўнага краю...

Спарахнелае чучала
Ад нянавісці лопнуць гатова —
Ад злабы да жывучага,
Да пявучага нашага слова.
Толькі гэтым і дыхае,
Толькі лютасцю чорнай клякоча.
З праімперскаю пыхаю
Нізавошта расстацца не хоча.
І зямелюхну наскую
Успрымаць без пачварнай натугі
Можа толькі пад назваю
Беларускай Ваеннай Акругі.

1997, чэрвень.

Як і заўсёды — з "дзякуем"

Штодзень адно і чуецца:
"Ну з'ешце нас, ну з'ешце!
Няўжо нямльзя расчуліцца
І нас глынуць нарэшце?

Уважце просьбу! Зжальцеся!
Труда вам тут ня вочань:
Адно шырэй разяўцеся —
Мы самі ў пашчу скочым!"

"З'ядзім, з'ядзім, не бойцеся! —
Гукаюць цар і світа. —
І хаўкнем так, як просіце, —
Суздром і цалкавіта!

Дурненькіх беларусікаў
Пераварыць мы згодны.
Глынём — як бедных трусікаў
Глытае ўдаў галодны.

Тым больш, што за вячэраю
Нам будзе так да смаку
Пачуць: "Прыміце з чэрава
Наш беларускі дзякуй!.."

1997, травень.

У той дзень, як у слаўным Барысаве...

У той дзень, як у слаўным Барысаве
Абвалілася ўраз "вертыкаль", —
Са спасылкай на чорта на лысага
Шэф падшэфных к сабе выклікаў.

Ён стагнаў ад бяссілля і немачы,
Пераймаўся — да слёз на вачах:
"І навошта ж было вам, не ўмеючы,
Станавіцца на доблесны шлях?

Ад эпохі таварыша Сталіна
І працягам наступных эпох
Адмыслова была ў нас пастаўлена
Школа "рваць і хапаць на хапок".

Гэта кожнага чына датычыла.
Вы ж на свой захацелі манер?
Не асвоіўшы курсу практычнага,
Асядлалі — і з ходу ў кар'ер?

Як падгадзілі мне вы ў Барысаве!
Намякаў жа: не трэба прыгод!
Ты хапай, ты грабі, ты бяры сабе,
Але ж так, каб не бачыў народ!

Паглядзелі б, як спраўна, як здорава
Гэта робяць "под сенью Кремля".
А цяпер вам, як беднаму з долара,
Пачынаць давядзецца з нуля".

1997, чэрвень.

Яшчэ адзін "Грамадзянін міру"

Днямі незвычайнае пасведчанне "Грамадзянін міру" атрымаў старшыня Беларускага камітэта міру Іван Кірычэнка. Гэты дакумент выдаецца Міжнародным рэгістрам грамадзян міру, які створаны ў 1946 годзе ў Парыжы французам Гі Маршанам. Пасведчанне сведчыць аб тым, што яго ўладальнік плённа папрацаваў на карысць умацавання міру і ўзаемапаразумення паміж народамі.

Галоўныя мэты згаданай арганізацыі — клопаты аб здароўі людзей, навакольным асяроддзі, павага да правоў чалавека, прапаганда агульначалавечых каштоўнасцей.

Сяргей ВАСІЛЬЧУК.

Возвращаясь к напечатанному

...Только через суд

Уважаемый главный редактор!

В вашей газете 22 мая с. г. было опубликовано обращение бывших военнообязанных в/ч 98312. В ходе его проверки организационно-мобилизационным управлением Главного штаба Вооруженных Сил Республики Беларусь выяснено следующее.

При перерегистрации и проверке законности выдачи удостоверений участникам ликвидации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС Министерством по чрезвычайным ситуациям сделано замечание в отношении военнообязанных, проходивших специальные сборы в войсковой части 98312, дислоцировавшейся в н.п.Ораное Киевской обл. Бывшим военнообязанным этой части (прачечный отряд) удостоверения выдавались и перерегистрировались ошибочно, считая, что н.п.Ораное входил в зону отчуждения. По разъяснению Министерства по чрезвычайным ситуациям — н.п.Ораное в эту зону не входит. В директиве начальника Главного штаба Вооруженных Сил Украины от 14.04.93 г. №63 "О введении в действие Перечня воинских частей, учреждений, предприятий и организаций, личный состав которых принимал участие в работах по ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС в зоне отчуждения" кроме частей военных округов Украины включены и все части Белорусского военного округа, принимавшие участие в ликвидационных работах как в зоне отчуждения, так и в зоне первоочередного отселения и зоне последующего отселения. В примечании к директиве установленным знаком помечены воинские части, дислоцировавшиеся в зоне отселения. Войсковая часть 98312 этим знаком не помечена.

В соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС", для установления статуса участника необходимы документы, подтверждающие:

— период участия в работах по ликвидации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС (1986—1989 гг.);

— зоны (населенные пункты), в которых проводились эти работы.

Постановлением Совета министров СССР и ВЦСПС от 5.06.86 г. №665—195, директивой заместителя министра обороны СССР от 22.06.86 г. №024 устанавливалось, что о работе в 30-километровой зоне производить запись в военных билетах с указанием периода времени исполнения обязанностей по ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС. В военных билетах личного состава в/ч 98312 в основном указан только период участия в ликвидационных работах, но не указаны зоны, населенные пункты, в которых они выполняли эти работы. Без этих сведений определить им статью льгот не представляется возможным.

В связи с этим военнообязанным в/ч 98312 необходимо дополнительно представить на комиссию документы, подтверждающие их работы в зоне отчуждения. Документы этой войсковой части в Центральный архив Министерства обороны Беларуси не поступали. Поэтому бывшим военнообязанным в/ч 98312 следует через народный суд по месту жительства на основании свидетельских показаний и других документов установить факт участия в ликвидационных работах в той или иной зоне радиоактивного заражения.

М.КАУРИН,
начальник организационно-мобилизационного управления Главного штаба Вооруженных Сил Республики Беларусь, генерал-майор.

Не там ищете лжеликвидаторов

22 мая в "Народной воле" было опубликовано обращение группы людей, которые были призваны в свое время на специальные воинские сборы для участия в работах по ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС. Считаю необходимым дать разъяснение по некоторым вопросам, связанным с ситуацией, в которую поставили указанных людей работники облвоенкомата.

Во-первых, воинские части, привлеченные к работам в чернобыльской зоне, за редчайшим исключением, не размещались в пределах самой зоны. Они размещались на некотором удалении от периметра зоны. Одним из основных мест размещения воинских частей и являлся район, расположенный вблизи поселка Ораное приблизительно в шести километрах от КПП "Дитятки" — основного въезда в 30-километровую зону.

Во-вторых, все воинские подразделения, размещенные вблизи пос. Ораное, работали в зоне, причем в ее наиболее "грязных" местах. Практически это были работы не просто в 30-километровой зоне (зоне отчуждения), а в ее 10-километровой или даже трехкилометровой частях, отличавшихся наибольшей радиоактивной загрязненностью. Военнослужащих ежедневно ввозили в зону на выделенные им участки работы и после смены возвращали в места дислокации.

В-третьих, в ходе всей чернобыльской эпопеи отношение именно к людям, призванным на "спецсборы" для работы в зоне, то есть к "партизанам", как их там называли, было самым безжалостным. Массами этих людей в буквальном смысле "затыкали самые опасные дыры". Мало того, что с ними практически не считались, привлекая к наиболее опасным работам и не обеспечивая их необходимыми средствами защиты и дозиметрического контроля, так их еще постоянно "обсчитывали", проставляя в учетные карточки заниженные во много раз дозы.

В связи с этим считаю необходимым заявить, что работники Гомельского облвоенкомата, в том числе и полковник А.Киселев, не там ищут лжеликвидаторов. Их, несомненно, хватало и хватает сегодня, но искать их следует не среди наиболее пострадавшей от полнейшего произвола и бесправия категории ликвидаторов. И без того наше государство поступило с ними бесчестно, пообещав полнейшую социальную защиту после опасных работ в Чернобыле и тут же забыв об этих людях. Поэтому "акцию" облвоенкомата и тех, кто толкнул их на такие действия, считаю неразумной, необоснованной и бесчестной по отношению к людям, несомненно, заслуживающим уважения и помощи.

Г.ЛЕПИН,
профессор, участник ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС с 1986 по 1992 год, председатель союза "Чернобыль".

Шчыра

Як мы сустракаліся з таварышам Чыкіным

Дзень добры, шаноўная "Народная воля"! Пішуць вам два студэнты-палітолагі. Хочам паведаміць вам аб сустрэчы, якая нядаўна адбылася ў нашага гурта з таварышам В.В.Чыкіным, лідэрам артадаксальных камуністаў і намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама.

Перш за ўсё нам раздалі па экземпляру газеты КПБ "Мы и время" (№8 за лістапад 1996 г.). Напэўна, камуністам-чыкінцам няма куды збыць астаткі састарэлага нумара. Сваю прамову т.Чыкін распачаў з аповяду пра восеньскі раскол ПКБ і рэзка асудзіў яе кіраўніцтва, словамі газеты "Мы и время" падвергнуўшы рэзкай крытыцы "ничем не оправданную политику соглашательства... с бешеными националистами, опьяненными преступной наживой торгашами..." На пытанне, якую пагрозу для Беларусі ўяўляюць сабой партыі Пазьняка, Багданкевіча і Калякіна, якія дбаюць пра суверэнітэт і канстытуцыйнасць у нашай краіне ў адрозненні ад яго партыі, якая марыць аб аднаўленні СССР, В.Чыкін прачытаў доўгую лекцыю аб тым, што краіны, якія маюць суверэнітэт, можна пералічыць па пальцах адной рукі. Да таго ж, першая беларуская дзяржава БССР была абвешчана дзякуючы камуністам. ВКЛ т.Чыкін беларускай дзяржавай не прызнаў, спаслаўшыся на тое, што існуюць розныя думкі на гэтую тэму. Калі ж мы дадалі, што БНР была абвешчана перш за БССР, т.Чыкін адмахнуўся рукой, быццам бы ўпершыню пачуў пра гэтае абвяшчэнне, чым выявіў свае дрэнныя гістарычныя веды.

Не менш цікава было пачуць аб інфармацыйным ціску СМІ з боку апазыцыі напярэдадні рэферэндуму. Калі мы папрасілі растлумачыць гэтыя дзівосныя выказванні, т.Чыкін пачаў падлічваць колькасць гадзін у інфармацыйных праграмах БТ і, насуперак яму, расійскіх каналаў, якія быццам бы толькі і рабілі, што агітавалі супраць Лукашэнкі. Дасталося і незалежным газетам, сярод якіх ён назваў "Свабоду" і "Народную волю", якія выдаюцца вялікімі тыражамі. Паколькі ён, т.Чыкін, знаёмы з газетнай справай, то ведае, што ўсялякая палітычная газета прыносіць толькі страты і трэба задумацца, адкуль незалежныя выданні бяруць грошы. Даволі цікава т.Чыкін адказаў і на пытанне аб фальсіфікацыі вынікаў апошняга рэферэндуму. Па яго словах, ён знаёмы з працэсам фальсіфікацыі (з чым ён толькі ні знаёмы!), але ён лічыць, што фальсіфікаваць магчыма толькі 5—7% галасоў.

На жаль, у нас не было часу ўдакладніць, як чыкінцы збіраюцца весці нас у светлую будучыню — камунізм, а таксама спытаць аб такіх добрых часінах дарагога яго сэрцу СССР, як 30-я гады.

Увогуле, уся гэтая сустрэча вельмі нагадвала фарс, галоўны выканаўца якога хлусіў у вочы і не вельмі клапаціўся аб тым, каб гэтую хлусню зрабіць падобнай да праўды. А шкада: слушную размову можна і трэба весці з усімі, але ж толькі тады, калі "чорнае" табе не прэзентуюць як бясспрэчнае "белае"...

Сяржук ШМЯЛЁЎ,
Зміцер КАШАВАР.

Мнение читателя

Народ не поет. Значит, вымирает?

О том, как плохо мы живем, свидетельствуют не только вечно скачущие цены, митинги и нищие на улицах...

Помню довоенное время. Мне — восемь лет. Старший брат в домашней суете поет "Вдоль по улице метелица метет". Голос у него — не хуже Лемешева. Но кто мог в то время его оценить? Смотров самодеятельности тогда еще не было, а для того, чтобы поехать в город на прослушивание, нужны были большие деньги...

Мне Бог такого шикарного голоса не дал. Но всю свою жизнь я пел, участвовал в конкурсах художественной самодеятельности. Есть даже грамоты. Случалось, что недоедал, но покупал грампластинки, книги по музыке. Я знал наизусть сотни песен...

Не могу объяснить причину, но в те времена пели все. И девушки за сотни метров узнавали своих кавалеров по песням. Сейчас другие времена. У меня ни сын, ни внук не поют, даже во время застолья. Зачем? Крути технику, там споют. Она, оказывается, сегодня заменяет голос души. Да и петь-то сегодня, по большому счету, нечего. Хорошая песня — редкость. Из песни куда-то ушла душа, мелодия. Все это заменили непонятная трескотня, ритмика, бой барабанов. Поэтому, что бы ни говорили о прошлом, я убежден, что лучшие песни все-таки рождены в советское время. Кто не помнит "Подмосковные вечера", "Я люблю тебя, жизнь", "Одинокая гармонь", "Миллион роз"? Их поют до сих пор.

Интересно, что останется от теперешней эстрады? Что войдет в историю?

В то время певцов было не так много, но было что слушать. Нынче наоборот. Почему новая эпоха не рождает новых Кобзонов, Лещенко, Ротару, Пугачевых, Леонтьевых?

Бывало, выйдешь вечером на прогулку, и слышишь в одной стороне "Рябинушку", в другой — "Ой, цветет калина", "Каким ты был". Сегодня на улицах чаще можно услышать брань, разборки...

Я не отрицаю, есть и на белорусской эстраде имена. Но народ не поет или почти не поет их песни за столом, в минуты печали и радости.

...Плохо, когда люди не поют. Значит, не до песен им и не до веселья. А ведь еще Гоголь в свое время писал, что "с песней человек рождается, пеленается, женится и хоронится".

Может, мы вымираем?..

К.Плигавка, ветеран войны, заслуженный работник культуры Республики Беларусь.
г. Докшицы.

Ён служыў прыгажосці

Беларуская інтэлігенцыя страціла аднаго са сваіх вядомых прадстаўнікоў. 11 чэрвеня на 66-ым годзе жыцця памер дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Юрый Аляксандравіч Карачун.

Сваей славай Нацыянальны мастацкі музей у многім абавязаны менавіта гэтаму чалавеку — тонкаму знатаку мастацтва, які ніколі не адступаў ад прынцыпу служыць Прыгажосці з вялікай літары.

БелТА.

Народны каляндар

Сёмуха

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёныя вянкі завіваць.
Заўём вянкі на ўсе сяткі,
На ўсе святкі, на ўсе празнічкі...

На **сёмым** тыдні пасля Вялікадня, у нядзелю, прыходзіць апошняе познавеснавое свята — *Сёмуха*, або *Тройца*. У гэтым годзе святкаванне Сёмухі прыпадае на 15 чэрвеня — на сёмую нядзелю пасля 27 красавіка.

Спрадвеку гэтае старажытнае язычніцкае свята сімвалізавала сабою заканчэнне веснавых палявых работ, провады вясны і надыход лета: "На зелянец (народная назва свята. — **К.Г.**) вясны канец". У XIV стагоддзі свята Сёмухі злілося з уведзеным Сергіем Раданежскім праваслаўным святам Святой Тройцы і стала непасрэдна залежаць ад святкавання Вялікадня.

Асаблівая ўвага ў сёмушныя дні надаецца зеляніне. Культ раслліннасці разам з культам продкаў і культам шлюбу складае аснову абрадавых дзеянняў "зялёнага свята". Адным з найбольш пашыраных з'яўляецца звычай упрыгожваць хату і двор галінкамі дрэў, кветкамі ды іншай зелянінай, якую называюць **"маем"**. Сцены, вокны, ганак, вароты аздабляюцца маладымі галінкамі ліпы, клёна, рабіны, а часцей за ўсё — галінкамі бярозы. Па стану гэтых галінак вызначаюць, якімі будуць лета і будучы ўраджай. Калі яны засохнуць хутка, трэба чакаць спякотнага лета і, зразумела, небагатага ўраджаю; і наадварот, можна было спадзявацца на багатую восень, калі на працягу тыдня галінкі захаваюць прыгажосць. Сёмушная зеляніна ахоўвала і жытнёвае поле, па кутках якога таксама ўтыкаўся "май".

Сёмуха лічыцца яшчэ і святам у гонар ушанавання продкаў. Вераць, што ў гэты дзень душы памерлых наведваюць родныя мясціны і нават нябачна прысутнічаюць на святочным застоллі. З гэтай нагоды людзі раніцой спяшаюцца на могілкі, робяць бярозавыя венікі і прыбіраюць магілы сваякоў.

Галоўнымі ўдзельніцамі свята Сёмухі з'яўляюцца дзяўчаты. Па абедзе яны збіраюцца гуртам і ідуць у лес **"завіваць бярозкі"**:

Ай, не радуйся, зялён дуб,
Ай, не радуйся, зялёны,
Не к табе ідзём вянкі віць.
Ай, узрадуйся, бяроза,
Ай, узрадуйся, белая,
Мы к табе ідзём вянкі віць.

* * *

Кожная з дзяўчат выбірае дзве побач стаячыя гнуткія бярозкі, разгойдвае іх, каб можна было ўчапіцца за вершаліны, якія потым сплятае ў "вянок". З дзвюх сагнутых дрэўцаў атрымліваецца рытуальная арка, праз якую трэба папарна, узяўшыся за рукі, тройчы прайсці туды і назад. Гэты абрад носіць назву **"кумленне"**:

Кумушкі-галубушкі,
Куміцесь, не браніцесь!
А раскуміўшыся, хоць дзярыцесь!

Абрад "кумлення" ўспрымаецца як своеасаблівае духоўнае ачышчэнне, як дараванне за былую абразу, крыўду. Таму пасля "кумлення" дзяўчаты становяцца сяброўкамі і прымаюць удзел у вяселлі, калі адна з іх бярэ шлюб.

Важнае месца ў траецкай абраднасці займае варажба на вянках з кветак або з бярозавых галінак. Завіваючы вянкі, дзяўчаты пускаюць іх на ваду і загадваюць на будучае замужжа: калі два вянкі на вадзе сыходзяцца — дзяўчына спадзяецца хутка выйсці замуж; чый вянок хутчэй прыстане да берага — тая, згодна з павер'ем, можа найхутчэй выйсці замуж.

Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці,
Люлі, люлі, на луг гуляці.
Мы саўём вяночкі, мы саўём зялёныя,
Люлі, люлі, саўём зялёныя.
Пусцім мы вяночкі на чыстыя воды,
Люлі, люлі, на чыстыя воды.
Вяночкі, плывіце, пра долю кажыце,
Люлі, люлі, пра долю кажыце.
Ці будзем мы жывы да цёплага лета,
Люлі, люлі, да цёплага лета.
Ці палюбяць нас хлопцы ўдалы,
Люлі, люлі, хлопцы ўдалы.
Ці павядуць нас у свае дамы,
Люлі, люлі, у свае дамы.

Праз тыдзень тыя ж дзяўчаты ідуць у лес "расплятаць бярозкі", бо лічыцца, што дрэва можа пакрыўдзіцца і ўчыніць шкоду. Абрадавыя дзеянні зноў жа суправаджаюцца песняй:

Гукала дзевачак бяроза вянкі
развіваць:
— Хадзіце, дзевачкі, вянкі разбіраць!
Прайшлі святкі,
Разаўём вянкі.
Зязюля перастала куваць,
Нашу долю сустракаць...

Падрыхтавала
Кацярына ГУТКОЎСКАЯ.

Пратэст

Абяцанкі Ерахава не грэюць. Ні душу, ні кішэні. А падводзіць БелВАР Масква...

На праспекце Францыска Скарыны ў тую раніцу недалёка ад ЦУМа было шматлюдна. Людзі падыходзілі да прахадной Беларускага вытворчага аб'яднання радыётэхнікі (БелВАР), але на працу ісці не спяшаліся. Каля сямі гадзін тут ужо сабралася звыш тысячы рабочых. Патрабаванне ў іх было адно: своечасова выплачваць зробленыя грошы.

Усім вельмі надакучылі разавыя падачкі па 40, 50, 100 тысяч рублёў. З імі нельга нават адзін раз наведаць магазін. А сем'і трэба карміць кожны дзень. Запазычанасць жа ў прадпрыемства значная і цягнецца месяцамі. Не атрымлівалі людзі грошы, зробленыя яшчэ ў красавіку, траўні...

Чакалі на БелВАРы паляпшэння фінансавага становішча і ад інтэграцыйнага Саюза з Расіяй. Але і ў суседкі-саюзніцы, відаць, справы ідуць не дужа. Бо толькі па лініі Міністэрства абароны Расіі запазычанасць БелВАРу складае 1,5 мільярда расійскіх рублёў, а ўсяго патрабуецца вярнуць толькі расійскіх даўгоў беларускаму аб'яднанню на суму ў 3,7 мільярда расійскіх рублёў, што ў пераліку на "зайцы" складае звыш 17 (!) мільярдаў.

Адсутнасць перадаплаты ў разліках з расійскімі спажыўцамі прыводзіць да дэфіцыту фінансаў. Калі ўвесці ў дзеянне эканамічныя рычагі і ўвогуле без папярэдняй грашовай аплаты не пастаўляць зробленую прадукцыю (а гэта радыёвымяральныя прыборы, электрабытавая тэхніка, якія ўсё ж карыстаюцца попытам на расійскім рынку), то хоць прыпыняй вытворчасць. Але гэта не лепшае выйсце. На аб'яднанні па-ранейшаму спадзяюцца, што расійскі бок з запазычанасцямі разбярэцца. І калі наладзяцца належным чынам сувязі, то своечасовыя разлікі Расіі з прадпрыемствам, на думку намесніка генеральнага дырэктара Пятра Кавалёва, змаглі б паставіць шлагбаум не толькі са спазненнямі ў выплатах заробку, але і значна палепшыць матэрыяльнае становішча працуючых на БелВАРы.

Да "страйкаўцаў-забастоўшчыкаў" звярнуўся генеральны дырэктар аб'яднання Мікалай Ерахаў. Але яго абяцанні і запэўніванні ніхто не стаў нават слухаць. Прафсаюзныя арганізацыі на сходах цэхаў выступілі з патрабаваннем выплаціць запазычанасці да 21 чэрвеня. А агульную канферэнцыю вырашылі перанесці на 16 чэрвеня.

Чаму БелВАР, колішняе абароннае прадпрыемства, дзе, здавалася б, праведзена канверсія, раптам апынуўся ў вельмі складаных умовах? Калі называць рэчы сваімі імёнамі, дык гэта не што іншае, як жабрацкае існаванне з-за нявыплат: спажыўцоў — заводу, завода — рабочым. Прадпрыемства месяцамі не можа рэалізаваць прадукцыю, якой літаральна затараны складскія памяшканні, як і атрымаць грошы за ўжо адгружаную. Ланцуг праблем. Хто разарве-парушыць іх досыць сцэментаванае кола?

Гісторыі з неплацяжамі паўтараюцца з года ў год. І летась, 28 чэрвеня 1996 года, калі падзеі адбываліся па сёлетняму сцэнарыю, праблему вырашылі проста: каб уціхамірыць, супакоіць узбуджаных "страйкаўцаў", абмежаваліся фінансавай дапамогай зверху — адзінкавымі грашовымі ўліваннямі. Але ж гэта ўжо не выпадак, а сістэма, калі такія ўліванні патрабуюцца штогод. Трэба ўвогуле пераглядаць падыходы да арганізацыі вытворчасці, рэалізацыі выробленай прадукцыі. Такія думкі, прапановы, патрабаванні ідуць у гэтыя дні з рабочага асяроддзя. Калі аператыўна меры не будуць прыняты, калектыў можа аб'явіць рашэнне аб недаверы дырэкцыі аб'яднання.

Як паведамілі ў Беларускай незалежнай асацыяцыі прафсаюзаў прамысловасці, сітуацыю актывісты трымаюць пад кантролем. Каб выказаны пратэст рабочых БелВАРа не перарос у страйк-забастоўку, кіраўнікам прадпрыемства прыйдзецца паклапаціцца аб сваёй дзелавой рэпутацыі і паказаць сябе людзьмі справы, а не абяцалкінымі.

Віталь ЧАВУСКІ.

День истории

14 июня

■ В 1777 году Конгресс США утвердил "звезды и полосы" в качестве государственного флага.

■ В 1917 году Лондон впервые бомбили германские аэропланы (до этого английскую столицу немцы бомбили с дирижаблей). Погибло 100 человек, и еще 400 было ранено.

■ В 1919 году представители партий меньшевиков и эсеров были выведены из состава ВЦИК Советов. После этого акта советская власть окончательно стала однопартийной (по большому счету, такой она остается у нас и поныне).

■ В 1927 году родился английский писатель-юморист Джером Кларка Джером, автор блистательной повести "Трое в лодке, не считая собаки". Кстати, неужели трудно было посчитать собаку?

■ В 1964 году Нельсон Мандела был приговорен к пожизненному заключению на острове неподалеку от Кейптауна. Проведя за решеткой почти три десятилетия, Мандела стал национальным героем, а на первых свободных выборах был избран президентом ЮАР. Повторит ли этот путь кто-нибудь из лидеров нашей оппозиции?

15 июня

■ В 1215 году английский король Иоанн Безземельный был вынужден даровать мятежным баронам "Великую хартию вольностей". Этот конституционный документ заложил основы власти парламента над государственными финансами. В хартии говорилось также, что ни один свободный человек не может быть арестован без законного приговора пэров.

■ В 1752 году американский физик и дипломат Бенджамин Франклин доказал, что металл притягивает молнии с помощью воздушного змея с металлической рамкой, запущенного во время грозы. Красивое, наверное, было зрелище.

■ В 1940 году СССР ввел войска в Литву. В тот же день началось формирование марионеточного "народного правительства", которое вскоре выступило с инициативой вхождения Литвы в состав Советского Союза.

■ В 1977 году началось строительство Минского метрополитена. Помните перегороженный заборами Ленинский проспект?

■ В том же 1977 году в Испании впервые после 41 года диктатуры состоялись свободные выборы. Так долго ждали...

16 июня

■ В 1917 году в Петрограде начал работу I Всероссийский съезд Советов. Делегаты, среди которых преобладали эсеры и меньшевики, поддержали политику Временного правительства и отклонили требования большевиков о прекращении войны и передаче всей власти Советам.

■ В 1935 году Конгресс США одобрил "Новый курс" президента Рузвельта — систему мероприятий по выводу страны из глубочайшего в ее истории экономического кризиса.

■ В 1937 году в перерыве между заседаниями XVI съезда КП(б) Б покончил с собой председатель ЦИК Беларуси Александр Григорьевич (!) Червяков. Один из основных участников создания БССР и Союза ССР, Червяков был активным сторонником политики белорусизации, что и привело к обвинениям его в национализме, прозвучавшим на съезде. Чтобы предотвратить арест и преследования его семьи, Александр Григорьевич застрелился.

■ В 1940 году, спустя два дня после вступления германских войск в Париж, британский премьер-министр У.Черчилль выступил с инициативой создания двуединого англо-французского государства ("органического союза" Англии и Франции). Что-то это мне напоминает...

■ В 1961 году во время турне ленинградского балета по странам Западной Европы знаменитый танцовщик Рудольф Нуриев сбежал во французском аэропорту Лё Бурже и попросил политического убежища. Кстати, а вы умеете танцевать?

■ В 1976 году жители густонаселенного пригорода Йоханнесбурга Соуэто восстали против насаждения в их школах языка белых хозяев страны — африкаанс. Еще до вмешательства войск в беспорядках погибло более тысячи человек. С тех пор черная община ЮАР отмечает эту дату как День Соуэто.

Даты подбирал и комментировал Юрий БОРИСЕВИЧ.

Дайджест

А что в зарубежной прессе?

От критики на теле-шоу упали... цены на мясо

Популярной американской телеведущей Опре Уинфри грозит оплата иска в размере 6 миллионов 700 тысяч долларов, пишет "Таймс". В суд обратился техасский скотовод Пол Энглер — он надеется возместить убытки, которые понес из-за слишком эмоциональных замечаний ведущей по поводу так называемого "коровьего бешенства". Некий воинственно настроенный вегетарианец, приглашенный на ток-шоу, заявил, что "по сравнению с коровьим бешенством СПИД кажется обычной простудой", после чего Опра объявила зрителям, что прекращает есть гамбургеры. Этот выпуск "Опра Уинфри Шоу" вышел год назад, за несколько минут до заключения фьючерсных сделок на Чикагской торговой бирже. Цены на мясо упали так резко, что упущенная выгода компании Пола Энглера составила более 6 с половиной миллионов долларов. Учитывая огромную популярность в США этого шоу и самой Опры Уинфри, неудивительно, что на грани разорения оказалось еще несколько мясоторговых фирм, а этот день скотоводы теперь называют "крах имени Опры".

Если преступник не опасен, его ждет... плавучая тюрьма

Плавучая тюрьма начнет работу 11 июня в городе Портленд, графство Дорсет, пишет "Таймс". Практика содержания малоопасных преступников на старых, непригодных к плаванию кораблях традиционна для Британии, но последние тюрьмы-корабли были закрыты еще во время правления королевы Елизаветы. Традиция возродилась в связи с необходимостью разместить полторы сотни новых тюрем в Англии и Уэльсе. По словам секретаря внутренних дел Джека Стро, корабль полностью отвечает требованиям пожарной безопасности и соответствует гигиеническим нормам. Управление тюрем и руководство порта решили, что плавучая тюрьма безопасна и для преступников, и для общества. Планируется, что на бывшем корабле флота Ее Величества будут отбывать срок одновременно 400 заключенных.

Генерал Абдул Малик меняет пристрастия

Очередное поражение потерпело исламистское движение "Талибан". Во вторник вечером формирования полевого командира Ахмада Шаха Масуда заняли стратегически важный город Пули-Хумри к северу от столицы Афганистана Кабула, сообщает "Франс пресс". Боевики "Талибана" отошли к расположенному в 15 километрах городу Баглан. Между тем в направлении Баглана движутся узбекские формирования под командованием генерала Абдула Малика. Напомним, что в конце мая генерал Малик поднял мятеж против фактического хозяина севера Афганистана Рашида Дустума, в результате чего антиталибская коалиция потерпела ряд существенных поражений, а сам Дустум был вынужден бежать из страны. Однако спустя некоторое время Малик опять поменял пристрастия и вновь примкнул к антиталибской коалиции.

В Германии нарушитель сам лишает себя водительских прав. По времени...

Невиданное до настоящего времени послабление нарушителям дорожного движения намерены сделать в ближайшее время правоохранительные органы Германии. По информации агентства ЕП, полиция намерена разрешить тем нарушителям правил дорожного движения, которые подлежат лишению водительских прав, самим решать, когда приносить свои права в отделение дорожной полиции и таким образом лишаться возможности управлять своим автомобилем. Агентство отмечает, что подобное послабление на фоне постоянно возрастающего числа дорожно-транспортных происшествий вряд ли будет встречено с одобрением представителями остальных правоохранительных органов страны.

Коровы с... серьгами. Электронными

В ближайшее время все домашние животные малазийского острова Лангкави будут носить специальные электронные серьги, контролирующие их поведение без помощи человека. По информации агентства ДПА, уже в настоящее время все коровы острова носят специальные серьги, которые предупреждают животных о приближении автомобилей и прогоняют их в безопасное место, что помогает предотвратить несчастные случаи. Агентство также сообщает, что в скором времени появятся серьги, выполняющие и другие функции, позволяющие животным расти практически без вмешательства человека.

Дети-сироты в роли "подопытных"

Более 25 лет австралийские дети-сироты были "подопытными кроликами" в руках ученых, пишет газета "Сидней Морнинг Геральд". Как стало известно автору статьи из официальных источников, ученые использовали детей-сирот в качестве объектов для испытания препаратов против гриппа, коклюша и лишая. Опыты проводились в детских домах штата Виктория. Причем в столице штата — Мельбурне — опыты над детьми стали проводиться еще с середины 40-х годов, отмечает "Сидней Морнинг Геральд". Газета также подчеркивает, что адвокаты ученых, занимающихся незаконными опытами, считают своих подзащитных невиновными и называют их "героями, спасающими людям жизнь".

Испания — пример для подражания? И для кого?

Испанская газета "Диарио-16" публикует материал, посвященный экономической и политической жизни страны. Газета сообщает, что по мнению большинства экспертов, в Испании наблюдается значительное противоречие между экономическим состоянием Испании и политическим курсом ее руководства. Газета отмечает, что в последнее время Испания достигла невиданного экономического роста и уже сегодня с полным правом может называть себя высокоразвитой страной. В то же время ее политическое руководство, по мнению газеты, все больше и больше напоминает диктаторские режимы развивающихся государств. В качестве примера газета приводит многочисленные факты нарушений прав человека, притеснения средств массовой информации и неправомерного лишения граждан социальной поддержки со стороны государства.

Гренландия: воды талые, а льды "алые"...

Таяние льда на севере и северовостоке Гренландии приобретает угрожающие масштабы. По информации агентства АПА, такие данные содержатся в опубликованном недавно докладе специалистов НАСА. Агентство также сообщает, что согласно имеющимся сведениям, ежегодно в океан попадает до восьми кубических километров талой воды, образовавшейся из гренландского льда. Агентство отмечает, что подобная скорость таяния льдов, вызванная загрязнением окружающей среды и глобальным потеплением климата, грозит непоправимыми последствиями для климата и населения всей планеты. Агентство также приводит мнение ученых, согласно которому до настоящего времени ни одна страна в мире не предприняла ничего, чтобы хоть как-нибудь попытаться решить эту проблему.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Глебу ў Паставах пачысцяць амерыканскім абсталяваннем

У кантэксце спецыялізаванай канферэнцыі па эфектыўнаму выкарыстанню былых ваенных аб'ектаў, а таксама экалагічных і эканамічных аспектах раззбраення на ракетнай базе ў Паставах адбылася афіцыйная цырымонія перадачы нашай рэспубліцы Злучанымі Штатамі Амерыкі высокатэхналагічнага абсталявання для абеззаражвання глебы.

— Гэта акцыя, — сказаў у час цырымоніі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ЗША ў Беларусі Кенэт Яловіц, — з'яўляецца доказам выканання ЗША сваіх абавязацельстваў прадаставіць Беларусі дапамогу ў выкананні ёю рашэння стаць бяз'ядзернай дзяржавай.

БелТА.

XX ВЕК: АКУЛЫ ДАЮТ ЖИЗНЬ

Спросите любого человека, который живет даже вдали от моря или океана, какое чувство вызывает у него слово "акула", и большинство наверняка укажут ужас. Однако каждый океанолог с уверенностью скажет вам, что гораздо ближе к истине в оценке акул стоят народы Тихоокеанского региона, которые считают, что акулы "дают жизнь". Эти люди верят, что тот, кто поцеловал акулу, может тем самым обезоружить ее. Но вряд ли аборигены могли предугадать, насколько они близки к истине с точки зрения последних научных исследований. Медицинские препараты с использованием некоторых органов этих животных на сегодняшний день являются одними из наиболее действенных средств в борьбе с раковыми заболеваниями. Однако обо всем по порядку. Акул, с любой точки зрения, можно считать существами крайне загадочными. Они появились на Земле раньше, чем динозавры. 400 миллионов лет назад еще не было рыб, морских млекопитающих, а акулы уже существовали, поэтому они по праву классифицируются нынче как одни из наидревнейших существ, проживающих на планете. Ученые склонны считать, что секрет долгожительства акул — в их плавниках и скелете из хрящей. Считается, что акульи зубы, которые неизменно вызывают ужас у каждого человека, в окаменевшем состоянии способны давать реакцию на яд — это их качество активно использовалось в средневековье. В жире акул в 10 раз больше витамина А, чем в обычном рыбьем жире. Но именно акулий хрящ вызывает особое восхищение у медиков-онкологов. Чистый акулий хрящ является основой пищевой добавки "Акулий хрящ-экстра", созданной Национальной академией питания США. Известно, что с 1975 по 1990 г. по всему миру было разработано 77 кардинально новых антираковых препаратов. Из них больше всего в США — 36, а в странах Восточной Европы, в том числе и в бывшем СССР, — единицы. Поэтому за неимением собственных нам приходится прибегать к импортным средствам. Пищевая добавка "Акулий хрящ-экстра" способна оказывать мощный профилактический эффект, а на начальных стадиях рака грудной железы, желудка и тонкого кишечника — сильное воздействие на растущую опухоль. Если же болезнь продвинулась далеко вперед и больной уже не в силах выдержать ужасные боли, препарат способен их уменьшить, снизить интоксикацию организма и порой замедлить развитие опухолевой ткани. Конечно же, лучше не попадать в ситуации, когда употребление "Акульего хряща-экстра" становится необходимостью — дай вам Бог хорошего здоровья. Но уж если случится беда, помните, что акулы вообще избегают всех болезней (к раку у них также стойкий иммунитет) именно благодаря хрящевому строению скелета, поэтому "Акулий хрящ-экстра" способен защитить и вас.

Сергей Питин.

Получить бесплатную консультацию сертифицированных специалистов и приобрести "Акулий хрящ" Вы можете в "Медицинском центре" по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 75, корпус 1.

Время работы: с 9.00 до 19.00 без выходных и перерыва.

Здесь также можно приобрести:

"Супер-Сжигатель жира №1" — натуральный продукт для избавления от лишнего веса и омолаживания организма без диет и физических нагрузок.

"Супер-Пчелиная пыльца" — богатейший источник энергии и жизненных сил.

"Про-Мэн-Экстра" — биологически активная пищевая добавка, способствует излечению мужчин от аденомы и воспалений предстательной железы.

"Супер-Йохимбе Экстракт" — натуральный продукт для повышения потенции и выносливости у мужчин естественным путем.

"Супер-Голденсил" — очиститель организма от шлаков и токсинов.

"Супер-Биокомплекс" — стимулятор функциональных систем организма.

Все препараты сертифицированы. Бесплатная доставка по городу Минску.

15-процентная постоянная скидка: инвалидам, участникам войны и ликвидаторам аварии на ЧАЭС.

Каждую субботу и воскресенье с 10.00 до 18.00 прием ведет врач высшей категории С.С.Горохов.

Будьте внимательны!

Штрих-код биодобавок, изготовленных в США, начинается с цифры "0" (информация Госстандарта). При покупке требуйте оригинальную цветную аннотацию. Опасайтесь дешевых подделок и самозванных консультантов!

Справки по телефону (017) 250-63-42.

14—21 чэрвеня

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ **ВЫСТАВЫ**

Нацыянальны мастацкі музей прапануе наведаць выставу Марка Шагала "Средиземноморские произведения, 1949—1985" з калекцыі Нацыянальнага музея М.Шагала ў горадзе Ніцы (Францыя) і прыватных калекцый нашчадкаў мастака (Францыя, Швейцарыя). Таксама тут працуе выстава графікі сучаснага англійскага мастака Пітэра Блэйка, прымеркаваная да Брытанскага тыдня культуры ў Мінску, які прысвечаны нацыянальнаму святу Вялікабрытаніі — Дню нараджэння каралевы Елізаветы II.

У Палацы мастацтваў — выстава твораў вялікага мастака, вучонага, пісьменніка і падарожніка Мікалая Рэрыха "Гімалаі". Экспануецца яшчэ выстава твораў таленавітых маладых мастакоў Р.Іванова, З.Луцэвіч, С.Малішэўскага, К.Селіханава, В.Песена. А таксама — выстава графікі і скульптуры "Шлях Ефрасінні Полацкай" Наталлі Апёк.

У Нацыянальным музеі гісторыі Беларусі можна пазнаёміцца з творчасцю сям'і Івановых (жывапіс, габелен, графіка), а таксама акунуцца ў свет "Казачных фантазій".

У галерэі візуальных мастацтваў "NOVA" экспануецца выстава "Фатограф і слова", дзе прадстаўлены творы Кірыла Ганчарова, Уладзіміра Цярэнцьева, Ігара Корзуна, Сяргея Кажамякіна, Андрэя Савіцкага, Ігара Саўчанкі, Уладзіміра Парфёнка, Юрыя Пятровіча, Людмілы Крытынскай і іншых.

■ **КАНЦЭРТЫ**

У канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі

18 чэрвеня — канцэрт арганнай музыкі. У праграме — музыка Фінка, Шумана, Гільмана.

20 чэрвеня — выступае Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі. Дырыжор — В.Собалеў, салістка — Ю.Стэфановіч (скрыпка). У праграме — Шыманоўскі, Сібеліус.

У зале камернай музыкі Белдзяржфілармоніі

17 чэрвеня — канцэрт камернай музыкі. А.Алоўнікаў (віяланчэль), Ю.Гільдзюк (фартэпіяна). У праграме — Бетховен.

19 чэрвеня — канцэрт камернай музыкі, наладжаны пры садзейнічанні Амбасады Італіі ў Рэспубліцы Беларусь. Р.Банучы (скрыпка), М.Раверэлі (фартэпіяна, Італія). У праграме — Тарціні, Даніцэці, Шуберт, Брамс.

У музычным клубе "Ріф"

14 чэрвеня — выступаюць маскоўская група "Коррозия металла" і мінскі гурт "Торнадо".

У Цэнтральным Доме афіцэраў

19 чэрвеня — першы канцэрт першага фестывалю добрай музыкі "Перекресток", у якім возьмуць удзел Наталля Плаціцына і дзядзя Міша (група "ДДТ"). Праграма называецца "Душа".

■ **КІНО**

У тэатральнай зале Палаца культуры прафсаюзаў ***праходзіць паказ фільмаў Пятра Ліліенталя "Другая рэальнасць"***

15 чэрвеня — "Паўстанне".

...Фільм, які распавядае пра апошнюю фазу сандыніцкага паўстання ў Нікарагуа.

"Веласіпедыст з Сан-Крыстобаля".

...Апавяданне пра канфлікт улады і асобы.

"Ла вікторыя".

...Маладая правінцыялка прыязджае ў сталіцу і марыць аб кар'еры сакратаркі. Зусім нечакана для сябе яна апынулася ў цэнтры палітычнай барацьбы.

16 чэрвеня — "У краіне пануе спакой".

...Драматычнае апавяданне пра "спакойнае" жыццё ў невялікай краіне пасля ваеннага перавароту.

"Настаўнік Хофэр".

...Нямецкая правінцыя напачатку стагоддзя. Новы настаўнік Хофэр канфліктуе з гаспадаром фабрыкі, дзе працуюць ягоныя вучні.

"Закланне Пітэра О'Хэя".

...Экранізацыя п'есы класіка абсурдзізму Славаміра Мрожэка.

З 17 чэрвеня — **Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь і федэрацыя "Кінаклуб" запрашаюць на рэтраспектыўны паказ фільмаў знакамітага акцёра, сцэнарыста, рэжысёра і прадзюсера Алена ДЭЛОНА "Возвращение самурая", які ў гэтым годзе святкуе 40-годдзе сваёй унікальнай кінематаграфічнай кар'еры, увенчанай ордэнам Ганаровага легіёна (вышэйшай узнагародай Францыі) і "Залатым мядзведзем" Берлінскага міжнароднага кінафестывалю за вялікі ўклад у мастацтва нашых дзён.**

17 чэрвеня — "На ярком солнце".

...Экранізацыя класічнага дэтэктыва Патрыцыі Хайсміт. Абаяльны авантурыст Рыплі вырашыў прысвоіць чужыя грошы і чужы лёс...

18 чэрвеня — "Самурай".

...Культавы "чорны" фільм 60-х гадоў, крыніца натхнення для Джона Ву і Квенціна Таранціна.

19 чэрвеня — "За шкуру полицейского".

...Узор напружанага і жорсткага "паліцэйскага" фільма.

20 чэрвеня — "Мелодия из подвала".

...Стары гангстэр Шарль, які выйшаў з турмы, распрацоўвае план жудаснага злачынства...

У кінатэатры "Змена" праходзіць рэтраспектыўны паказ фільмаў Ларысы Шэпіцька.

17 чэрвеня — "Узыходжанне" з Барысам Плотнікавым у галоўнай ролі, а таксама "Ларыса". Як заўсёды, пасля прагляду фільмаў адбудзецца сустрэча са стваральнікамі фільма, мастацтвазнаўцамі і пісьменнікамі.

■ **ТЭАТРЫ**

У Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета

14 чэрвеня — Дж.Расіні "Севільскі цырульнік", камічная опера ў дзвюх дзеях.

15 чэрвеня — канцэрт удзельнікаў дзіцячага музычнага тэатра-студыі. Увечары — К.Орф "Карміна Бурана", Ж.Бізэ —Р.Шчадрын "Кармэн-сюіта", прадстаўленне ў адной дзеі.

17 чэрвеня — Ж.Бізэ "Кармэн", опера ў чатырох дзеях.

18 чэрвеня — А.Адан "Карсар", балет у трох дзеях.

19 чэрвеня — **ПРЭМ'ЕРА!** А.Барадзін "Князь Ігар", опера ў дзвюх дзеях.

20 чэрвеня — **ПРЭМ'ЕРА!** А.Глазуноў "Раймонда", балет у трох дзеях.

21 чэрвеня — Дж.Пучыні "Чыа-Чыа-сан", опера ў трох дзеях.

У Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы

14 чэрвеня — "Лес". На Малой сцэне — "Смех лангусты".

15 чэрвеня — на Малой сцэне — "Віват, імператар!"

16 чэрвеня — творчая вечарына народнага артыста Беларусі Аўгуста Мілаванава.

18 чэрвеня — "Ажаніцца — не журыцца!"

19, 20 чэрвеня — "Чароўная ноч".

21 чэрвеня — "Ідылія", на Малой сцэне — "Віват, імператар!"

У Дзяржаўным акадэмічным рускім драматычным тэатры Рэспублікі Беларусь імя М.Горкага ***праходзяць гастролі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.***

15 чэрвеня — М.Булгакаў "Полоумный Журден", мальерыяна ў дзвюх дзеях.

...Тэатр у тэатры. У акцёраў на руках ролі новай п'есы. Мальер, які павінен быў выконваць галоўную ролю, хворы. А заўтра — спектакль у караля...

У Нацыянальным тэатры музычнай камедыі

18 чэрвеня — "Ночь в Венеции".

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор" запрашае

18 чэрвеня — на культурна-гумарыстычнае мерапрыемства "Ад Чыжоўкі да Камароўкі".

19 чэрвеня — на эстраднае прадстаўленне "Добра сядзім!"

Падрыхтавала Марына КОКТЫШ.

Хочаце верце, хочаце — не верце

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Авенам (21 сакавіка — 20 красавіка) — каханне. Амаль увесь тыдзень вы, як сцвярджаюць зоркі, будзеце карыстацца прыхільнасцю планет, таму ніякіх глабальных праблем і пераменаў у вашым жыцці пакуль што не прадбачыцца. На гэтым тыдні вы, не выключана, будзеце дзейнічаць насуперак сваім звычкам, даволі абдумана. Верагодна, гэтая тэндэнцыя прывядзе вас да пераасэнсавання прафесійнага шляху. Будзеце поўны энтузіязму і страсці, але гэта не перашкодзіць вам праяўляць часам нават залішнюю агрэсіўнасць.

Цяльцам (21 красавіка — 21 мая) — перашкоды і выпрабаванні. Але няхай вас гэта не турбуе: ваш знак ад прыроды надзелены здольнасцю цаніць маленькія радасці жыцця. Фінансавая сфера — адзіная, дзе на гэтым тыдні вас чакаюць кардынальныя змены, ды і тыя — станоўчыя. У каханні, як сцвярджаюць планеты, — поўная гармонія. Для сямейных тыдзень будзе адзначаны роскзітам кахання. Дарэчы, пасля доўгага перапынку можна нарэшце крыху расслабіцца на рабоце — "чорная" паласа мінула. Што датычыць здароўя, то, як сцвярджаюць планеты, у другой палове тыдня намячаецца прыкметны прыліў сіл.

Блізнятам (22 мая — 21 чэрвеня) — шчырую ўсмешку сябра. Калі не паддадзіцеся жаданню рабіць спусташальныя і марныя пакупкі, нарэшце зможаце правільна размеркаваць свой бюджэт. У амурных справах, як сцвярджаюць зоркі, наступіць перыяд зацішша: вы будзеце думаць пра ўсё, толькі не пра каханне. Прачнецеся вы, як мяркуюць планеты, толькі ў другой палове тыдня.

Ракам (22 чэрвеня — 23 ліпеня) — каверзы фартуны. Будзеце ад жыцця на гэтым тыдні атрымліваць асалоду. Зоркі раяць карыстацца момантам, бо надыходзячы месяц можа быць для вас вельмі складаным. Звярніце таксама ўвагу на фінансавы аспект — нечакана могуць з'явіцца непрадбачаныя расходы. Не выключана, што на рабоце праявіце вялікую актыўнасць, таму зоркі раяць падумаць, у які бок лепш накіраваць прыліў энергіі.

Львам (24 ліпеня — 23 жніўня) — пакаянне. Ваш лёс — у вашых руках. Таму не варта моцна разлічваць на чыюсьці падтрымку альбо дапамогу. Пастарайцеся, каб ваша прага да славы была не вельмі прыкметнай. У адваротным выпадку можаце нажыць сабе ворагаў. Тыдзень запомніцца поўным узаемаразуменнем, важнай сустрэчай, буйнымі расходамі і зменай настрою. Добры перыяд для стажыровак, вышуку сувязяў з аўтарытэтнымі асобамі.

Дзевам (24 жніўня — 23 верасня) — вучобу і плённую працу. Не выключана, што на працы ваша энергія падвоіцца і вы здолееце знайсці неабходную падтрымку для рэалізацыі сваіх планаў. Аднак зоркі раяць не перастарацца і не развіваць асабліва буйной дзейнасці — гэта можа дрэнна адбіцца на стане вашага здароўя. Калі ў мінулым месяцы вы зарабілі пэўны капітал, то на гэтым тыдні зможаце яго паспяхова памножыць.

Шалям (24 верасня — 23 кастрычніка) — фінансавыя паступленні і добры настрой. Магчыма, будзеце акружаны морам кахання, пяшчоты і дружбы. Напрыканцы тыдня верагодна сустрэча, якая зменіць ваша жыццё не ў лепшы бок. Дарэчы, калі вы ўжо паспелі сапсаваць з кімсьці адносіны, не марудзьце — рабіце першы крок і садзіцеся за "стол перагавораў". Не выключана, што на працы вы зможаце своечасова знайсці патрэбныя рашэнні і выбраць найлепшую стратэгію, але, дасягнуўшы свайго, зоркі раяць не расслабляцца, а крочыць далей.

Скарпіёнам (24 кастрычніка — 22 лістапада) — невялікае падарожжа. Калі будзеце сябе з годнасцю паводзіць, гэты тыдзень стане для вас перыядам удач, у час якога можна будзе смела ісці наперад. Не выключана, што абставіны прымусяць вас выконваць у поўным аб'ёме свае сямейныя і прафесійныя абавязкі. Не расстройвайцеся дарэмна і не вешайце раней часу нос — у хуткім часе ўсё нармалізуецца і былыя праблемы здадуцца непрыемнай дробяззю.

Стральцам (23 лістапада — 21 снежня) — сямейныя клопаты. Калі вам раптам на нейкі час здалося, што нечакана ўзнікшая сувязь — усяго толькі флірт, то вы, сцвярджаюць зоркі, памыляецеся. І развівацца яна будзе ў сур'ёзным накірунку. Магчымасці, якія вас чакаюць напрыканцы тыдня, верагодна, дапамогуць выбрацца з цяжкага фінансавага становішча. Планеты запэўніваюць, што вы не дарэмна гнулі спіну і стрымлівалі сябе так доўга — вынікі на парозе.

Казярогам (22 снежня — 20 студзеня) — шчырасць лёсу. Верагодна, дзякуючы сваёй упартасці і вытрымцы, вам удасца схаваць ад навакольных свае хваляванні і непатрэбныя эмоцыі. Аднак тое, што павінна адбыцца на наступным тыдні, выразна прадэманструе, што амаль усе хваляванні часам былі выкліканы выключна вашымі пужлівымі фантазіямі. Мабыць, у другой палове тыдня настрой палепшыцца. Гэтаму, як сцвярджаюць зоркі, будзе спрыяць і вялікі фінансавы куш.

Вадалеям (21 студзеня — 19 лютага) — тэлефонныя размовы. Зоркі не раяць вам забываць, што жыццё — гэта няспынная барацьба. І калі ў вас у думках новая справа, адкладзіце яе пачатак на наступны месяц. Дарэчы, тыдзень запомніцца рамантычнымі прыгодамі, радаснымі перспектывамі і будзе пафарбаваны ў даволі аптымістычны колер. Але планеты нагадваюць, што новыя гарызонты раскрываюцца перад вамі не так лёгка, як здаецца на першы погляд. Вам давядзецца шмат папрацаваць. Будзьце больш уважлівымі за рулём.

Рыбам (20 лютага — 20 сакавіка) — рамантычныя прыгоды. Узнагарода за вашу празмерную працу, сцвярджаюць планеты, абяцае быць адэкватнай затрачаным сілам. Пры ўмове, што вы не будзеце вельмі многа аб гэтым гаварыць з навакольнымі. Планеты раяць выкарыстаць дадзены лёсам шанц і, нягледзячы на вялікую колькасць працы, адправіцца ў прыемнае падарожжа з дарагім сэрцу чалавекам. Будзьце асцярожнымі з электрапрыборамі.

ТЕЛЕПРОГРАММА (сохрани на всю неделю!)

Понедельник, 16 июня

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.10 "Музыкальная обойма".
7.50 , 17.45 Экономикст.
8.00 Резонанс.
8.50 "Телебарометр". Прогноз погоды.
9.00 Здоровье.
9.35 Конный спорт. Кубок Volvo.
10.05 Темная комната.
10.30 "Западный Вайкики". Телесериал.
11.20 Арт-клуб.
11.50 По Вашим просьбам. "Государственная граница". Телевизионный многосерийный худ. фильм. Фильм 4-й. "Красный песок". 1-2 серия.
13.00, 15.00, 18.00, 0.05 Новости.
14.25 Бонтон. Тележурнал моды.
15.15 Видеокурс французского языка.
15.45 "Приключения Скиппи". Телесериал для детей. (Австралия).
16.15 "На добрый лад".
16.30 Гости в дом.
17.00, 20.25 Музыкальный антракт.
17.10 Родное слово.
18.20 "Западный Вайкики". Телесериал.
19.15 Тема дня.
19.35 "Дело по обвинению". Фильм 3-ий. "Признать виновным".
20.10 "Кто это?". Телеигра.
20.15 "Акционерное общество "Гомельстекло" представляет...". Видеофильм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Фильмотека. "Гадюка". Худ. фильм.
23.35 Концертный сезон.

ОРТ

Техническая профилактика до 17.00.
17.00, 0.50 Новости.
17.20 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
18.05 Погода.
18.10 Час пик.
18.35 Угадай мелодию. Телеигра.
19.00 Понедельник с Познером. Программа "Мы".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 Они помогали Штирлицу. Легенды разведки в фильме "Путь в "Сатурн".
22.20 Михаил Глузский в программе "Театр + TV".
23.05 "Линия кино". Михаил Глузский в фильме "Монолог".
1.00 Пресс-экспресс.
1.10 Программа передач.

Канал "Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.15 С добрым утром!
8.00 Православный календарь.
8.05 "Клубничка". Телесериал.
8.35 Сам себе режиссер.
9.10 "Санта-Барбара".
14.05 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
14.45 Образ жизни.
15.10 "Красная книга". Экологическая экспедиция РТР.
15.25 "Клубничка". Телесериал.
16.15 Там-там новости.
16.25 Лукоморье.
16.50 Посмотри на себя.
17.05 Россияне.
17.20 Пульс.
18.00 "Санта-Барбара".
19.35 Добрый вечер.
20.15 Баскетбол. Чемпионат НБА. Финал. Передача из США.
21.15 "Эх, дороги!"
22.30 Программа передач.
22.40 Дежурная часть.
23.05 Брайан Адамс в Кремле.

Санкт-Петербург

13.35 Срок ответа сегодня.
14.05 Советы садоводам.
14.25 Театральная провинция?
14.55 Международное обозрение.
15.30, 18.30, 20.25 Информ-ТВ.
15.40 Телевизионная служба безопасности.
15.55 "Пивные бароны". Худ. фильм (Франция).
16.45 Ребятам о зверятах.
17.05 Я ничего не знаю, кроме солнца.
17.25 Телемагазин.
18.45 Спорт.
18.55 Большой фестиваль.
19.10 "История любви". Сериал.
20.00 — 21.30 Телестанция "Моя Россия".
20.30 Программа Вятского телевидения.
20.55 "Пенальти". Футбольное ток-шоу.
21.30 "Пивные бароны". Худ. фильм (Франция). 4-я серия.
22.20 Событие.
22.35 Телеслужба безопасности. "Вне закона".

НТВ

5.00 Сегодня утром.
9.15 Утречко.
9.30 Женские истории. Марчелло Мастроянни и Роми Шнайдер в мистической мелодраме Дино Ризи "Призрак любви" (Италия).
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
12.00 Открытый мир.
12.45, 0.00 Телемагазин.
13.20 Большое "Времечко".
15.35 Дистанция 60.
16.35 Кинотеатр юного зрителя. Худ. фильм "Голубое дерево".
17.30 Футбольный клуб.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.05 Мир кино. Джанни Челесте, Альфредо Либасси, Сальваторе Термини, Маурицио Пролло в криминальной драме Джорджио Кастеллани "Загубленные жизни" (Италия).
21.45 Час сериала "Крутой Уокер: правосудие по-техасски".
22.40 Времечко.
23.00 Сегодня в полночь.
23.20 Ночное "Времечко".

ТВ-6 Москва

6.00, 8.00, 13.50, 18.55, 20.00, 22.45 Шесть новостей.
